Касьцёл
Сьв. Сымона і Сьв. Алены





Касьцёлы Менска

Ул. Дзянісаў

Касьцёл сьв. Сымона і сьв. Алены



Менск, 1996

ЗЬМЕСТ

ПРАДМОВА 3
УСТУП 6
СЬВЯТЫНІ МЕНСКА 9
ЛЁСЫ КАСЬЦЁЛАЎ 10
ВЕРУЮЧЫ МЕНСК 12
ЗАСНАВАЛЬНІК 14
АРХІТЭКТАРЫ 18
БУДАЎНІЦТВА 32
АСЬВЯЧЭНЬНЕ 35
НОВЫ ЧАС 38
ВЯРТАНЬНЕ 42
АДРАДЖЭНЬНЕ 44
РЭСТАЎРАЦЫЯ 47

Навуковыя рэдактары:
– кандыдат гіст. навук З. Шыбека
– кандыдат філ. навук Л. Канаплянік

Фатограф – Ул. Суцягін

Аўтар помніка Міхалу–Арханёлу – скульптар Ігар Голубеў

ПРАДМОВА

Паважаная моладзь!
Шаноўныя мінчане!
Шаноўныя госьці горада!

Дзякуючы пераменам у нашым грамадстве, адраджэньню і аднаўленьню амаль ва ўсіх сферах чалавечага жыцьця, асабістага і грамадскага, адраджаецца і наша духоўная спадчына. Мы адраджаем запушчаныя і многімі забытыя духоўныя крыніцы—Сьвятыні. Усё часьцей у нашым родным краі, Беларусі, бачым адноўленыя ці то наноў пабудаваныя храмы, як каталіцкія, так і праваслаўныя, якія і прызваны Богам быць духоўнымі крыніцамі для падтрымкі нашага маральнага і сьвядомага ладу жыцьця, а таксама і збавеньня сваёй душы.

Калі расчышчаюць запушчаную і забытую па прычыне нядбальства ці варожасьці крыніцу, тады яна зноў дае жывую, чыстую ваду для ўсіх людзей, як дзяцей, так і дарослых, простых і вучоных, бедных і багатых, таму што вада — гэта жыцьцё. І нашым сьвятым абавязкам з'яўляецца вяртаньне да жыцьцёвых каранёў нашай духоўнай культуры: калі хочам добра жыць, трэба трымацца сваёй духоўнай спадчыны, сваёй гісторыі, сваіх бацькоў.

Без каранёў памірае расьлінны сьвет. Без радыёсувязі з зямлёю і чалавекам гінуць караблі, самалёты, падводныя лодкі, касьмічныя спадарожнікі. Так і чалавек без духоўнай сувязі праз малітву з Усявышнім губляецца, застаецца адзін самотны на гэтай зямлі і гіне, заканчваюць сваё існаваньне цывілізацыі, распадаюцца сістэмы, бо згубіліся ў пошуках толькі матэрыяльных ідэалаў.

Чалавек і чалавецтва, калі не мае духоўных ідэалаў, вышэйшых над зямнымі, г. зн. калі губляе сувязь са Стварцам—Богам, хоць яшчэ жыве і дзейнічае, але наканаваны на беспасьпяховасьць і пагібель, як той карабль без сувязі з зямлёю, блукаючы ў адкрытым акеане падчас непагоды, нягледзячы на тое, што мае запас ежы, але на як доўга?

У нашым краі сьвятыні красуюцца вежамі, крыжамі — гэта духоўныя антэны, якія яднаюць нас з Богам, нясуць добрую ауру, ачышчэньне, якое атрымліваем у Доме Божым, дзякуючы малітве і сьвятым Сакрамантам (Таінствам), як Хрышчэньне, Споведзь, Шлюб і інш. Дзякуючы Сьвятыні чалавек праз малітву і духоўнае ачышчэньне ўзмацняе свой слабы дух Божай Усемагутнасьцю, каб у далейшым жыцьці быць вытрывалым, моцным, цярплівым, добрым...

Адной з такіх сьвятыняў з'яўляецца касьцёл сьв. Сымона і сьв. Алены ў Менску.

Штодзённа многія людзі з вялікай зацікаўленасьцю наведваюць гэты Храм, хочуць ведаць яго гісторыю.

Таму ўжо вельмі даўно ў мяне ўзьнікла думка, каб з дапамогаю гісторыкаў і навукоўцаў падаць Вам, добрыя людзі, такую кніжку—буклет, а з часам і поўную, абшырную працу аб гісторыі гэтага касьцёла.

Асабліва зьвяртаюся да Вас, маладыя людзі, выкарыстоўвайце добра дадзены Вам Богам час, бярыце прыклад з жыцьця і дзейнасьці добрых, высокародных і духоўна багатых людзей, а таксама прыклад са Сьвятых, якія жылі перад намі.

Шаноўныя бацькі, давайце добры і трывалы прыклад дзецям, моладзі, як словам, так і ўчынкамі, паводзінамі, жыцьцём. Толькі тады Вы будзеце жыць у памяці пакаленьняў, а перад Богам ваша ўзнагарода.

Спадзяюся, што гэтая кніга дапаможа ўдумацца і зрабіць вывад, што кожны з нас павінен збудаваць духоўны храм у сваім сэрцы і жыцьці.

Пробашч касьцёла
сьв. Сымона і сьв. Алены
ксёндз—магістр
Уладыслаў Завальнюк

УСТУП

Комплекс касьцёла сьв. Сымона і сьв. Алены, безумоўна, з'яўляецца самым выдатным помнікам манументальнай архітэктуры пачатку 20 ст. у Менску. Храм быў пабудаваны ў 1905–1910 гг. паводле праекта архітэктара Т. Пайздэрскага ў новараманскім стылі. Фундатарамі і ініцыятарамі будаўніцтва гэтай сьвятыні былі Эдвард Вайніловіч і ягоная жонка Алімпія з Узлоўскіх. Яны вырашылі зрабіць вялікае ахвяраваньне і пабудавалі касьцёл сьв. Сымона і сьв. Алены як помнік аб сваіх памерлых дзецях.

Сына Эдварда Вайніловіча назвалі ў гонар сьвятога Сымона Апостала. Дзень сьв. Сымона Апостала – 28 кастрычніка – парафіяльнае сьвята.

Дачку назвалі ў гонар сьвятой Алены – Маці імператара Канстанціна Вялікага, які ў 325 г. прызнаў хрысьціян і забараніў перасьледаваньні. Яго маці сьв. Алена клапацілася аб адшуканьні Крыжа Езуса Хрыста. Дзень сьв. Алены – 18 жніўня – парафіяльнае сьвята. На абразку сьвятая Алена стаіць абдымаючы вялікі крыж.

У праектаваньні і будаўніцтве храма бралі ўдзел архітэктары Ул. Марконі і Г. Гай. Інтэр'еры храма былі аздоблены мастаком Ф. Бруздовічам і скульптарам З. Оттам.

Гісторыя гэтага храма, як і многіх іншых сьвятынь на Беларусі, вельмі драматычная. Доўгі час улады імкнуліся зьнішчыць касьцёл, а на

ягоным месцы паставіць вялізны кінатэатр. Толькі дзякуючы намаганьням грамадскасьці ўдалося выратаваць гэты выдатны знакаміты комплекс.

Сталася так, што ў апошнія гады будынак касьцёла сьв. Сымона і сьв. Алены ператварыўся ў сапраўдны сімвал Менска. Яго выяву можна ўбачыць і на паштоўках, і на памятных знаках, экслібрысах, у шматлікіх выданьнях па гісторыі Менска. Сярод менчукоў касьцёл сьв. Сымона і сьв. Алены лічыцца адным з самых шанаваных, увага і цікавасьць да якога ніколі не слабелі. Пра касьцёл хадзілі розныя чуткі, расказваліся легенды, часам самыя неверагодныя...

Кажуць, што дачка Вайніловічаў, Аленка, была сьціплай, разумнай, набожнай дзяўчынкай, мела надта ўражлівую натуру і часта прасіла бацькоў, каб тыя дапамагалі бедным і нямоглым. З самага маленства Аленка захаплялася жывапісам, мела добры мастацкі густ, шмат малявала і свае працы—малюнкі прадавала, а за атрыманыя грошы купляла бедным хлеб, ежу. Сьмерць брата Сымонкі адгукнулася рэзкім, невыносным болем у сэрцы дзяўчынкі. Аленка стала яшчэ больш ціхай, задумлівай, часта малілася. А калі захварэла сама, то аднаго разу ў сьне ўбачыла рэдкага хараства храм. Сьвятыня была такой маляўнічай, дзівоснай, што Аленка яшчэ доўга пасьля гэтага выпадку спрабавала перанесьці свае незвычайныя адчуваньні на паперу. Перад самай жа сьмерцю прасіла бацькоў пабудаваць сьвятыню, дзе б людзі ўзносілі чыстую хвалу Пану Богу.



Фундатарскі алтар у бакавым нэфе касьцёла.
Пачатак 20 ст.

СЬВЯТЫНІ МЕНСКА

Існуе паданьне аб фундацыі ў Менску ў канцы 14 ст. каталіцкага касьцёла вялікім князем Вялікага Княства Літоўскага і каралём Польшчы Ягайлам, але, як сьведчаць архіўныя крыніцы, першая каталіцкая сьвятыня была пабудавана ў Менску на пачатку 16 ст. На ўзвышшы, што знаходзілася **на левым беразе ракі Сьвіслач**, каля **1508 г. быў пабудаваны драўляны фарны касьцёл сьв.Тройцы. Дзякуючы храму гэтая частка Менска атрымала назву Траецкая Гара, а потым– Траецкае прадмесьце.** У 17 ст. у горадзе былі заснаваны кляштары:

– дамініканцаў (1605 г.),
– бернардзінцаў (1624 г.),
– бернардзінак (1633 г.),
– бенедыктынак (1633 г.),
– францысканцаў (1676 г.).

У 1654 г. кс. біскупам смаленскім Геранімам Сангушкам быў набыты для ордэна езуітаў мураваны палац і пляц на галоўнай плошчы горада. Потым на гэтым месцы ў пачатку 18 ст. езуіты пабудавалі вялікі мураваны касьцёл у стылі барока. У 18 ст. у Менску з'явіліся кляштары:



Цэнтр Менска ў сярэдзіне XIX ст.

– баніфратаў (1700 г.),
– кармелітаў (1703 г.),
– рахітаў (1752 г.),
– бенедыктынцаў (1764 г.),
– мар'явітак (1771 г.).

У канцы 18 ст. у Менску налічвалася 12 каталіцкіх храмаў, 5 уніяцкіх і адзін праваслаўны манастыр. У 1798 г. была заснавана менская каталіцкая дыяцэзія, а былы касьцёл езуітаў ператвораны ў катэдральны.

ЛЁСЫ КАСЬЦЁЛАЎ

На працягу 19 ст. большасьць гэтых сьвятынь была зачынена. Частка з іх была перададзена праваслаўнай царкве, некаторыя прыстасаваны пад розныя гаспадарчыя патрэбы, а астатнія прададзены на знос. У 1869 г. была ліквідавана і менская дыяцэзія.

У канцы 19 ст. Менск, які тады налічваў больш за 90 тысяч жыхароў, меў толькі адзін вялікі каталіцкі храм. Гэта быў былы езуіцкі, потым катэдральны Марыінскі касьцёл, які пасьля ліквідацыі менскай дыяцэзіі стаў парафіяльным. Акрамя таго, па–за межамі горада на Залатагорскіх могілках знаходзіўся невялікі мураваны касьцёл сьв. Троіцы. Яшчэ адзін каталіцкі храм, а дакладней, капліца, стаяў на Кальварыйскіх могілках, што знаходзіліся на адлегласьці некалькіх кіламетраў ад горада.



Галоўны фасад касьцёла і плябанія паводле праекта Т. Пайздэрскага

ВЕРУЮЧЫ МЕНСК

Як неаднаразова скардзіліся вернікі, у нядзелі і вялікія сьвяты ўвайсьці ў храмы з–за вялікай колькасьці людзей было амаль немагчыма.[1,1] Таму ў Менску ўзнікла неабходнасьць у пабудове новага касьцёла і стварэння асобнай каталіцкай парафіі.

Упершыню пытаньне аб будаўніцтве новага касьцёла ў Менску было ўзьнята каталіцкай грамадскасьцю толькі ў самым канцы 19 ст. 20 чэрвеня 1897 года ў менскую гарадскую думу зьвярнуліся Ф. Віткоўскі, Ян Філіповіч–Дубовік, І. Віткевіч з просьбай, у якой было запісана, што менскі губернатар Трубяцкі:

> "...заявіў нам, просьбітам, што для таго, каб хадайніцтва аб пабудове ў Менску Рымска–Каталіцкага касьцёла магло мець посьпех, неабходна пашукаць месца для пабудовы і скласьці план і каштарыс... Азнаёміўшыся як з гарадскімі, так і прыватнымі пляцамі, мы прыйшлі да перакананьня, што адзіна прыдатнае месца для пабудовы касьцёла – гэта пустуючы пляц гарадской зямлі, які знаходзіцца на рагу Пецярбургскай і Каломенскай вуліц і заняты пад гарадскі дрывяны склад.
>
> А таму маем гонар пакорна прасіць гарадскую думу ўвесь названы пляц аддаць пад пабудову Рымска–Каталіцкага касьцёла." [2]

25 жніўня 1897 г. Менская гарадская дума прыняла пастанову:

> "Аддаць камітэту па пабудове пляц зямлі, на якім знаходзіцца дрывяны склад, у арэнду тэрмінам на 99 гадоў па 4 кап. за кв. саж."

Копія гэтай пастановы была накіравана менскім губернатарам М. Трубяцкім у Міністэрства ўнутраных спраў. Міністэрскія чыноўнікі, спасылаючыся на тое, што рашэньне пра пабудову новага касьцёла не было ўзгоднена з кіраўніцтвам менскай праваслаўнай епархіі і не атрымала падтрымкі ў самім міністэрстве, адпісалі, што

"...пастанова гарадской думы аб здачы ў арэнду зямлі пад Рымска–Каталіцкую царкву не можа быць прыведзена ў выкананьне".

Адначасова менскі губернатар у сваім лісьце 8 студзеня 1898 г. запатрабаваў ад гарадской думы, каб яна анулявала свой дазвол. На некалькі гадоў справу аб пабудове новай сьвятыні давялося спыніць. У 1903 г. у менскую гарадскую думу зноў была накіравана заява "прадстаўнікоў парафіян Рымска–Каталіцкага катэдральнага касьцёла", якую падпісалі самыя паважаныя і вядомыя жыхары горада. У заяве было сказана, што

"...у выпадку дазволу пабудовы касьцёла Міністэрствам унутраных спраў, горад прапануе даць пад пабудову пляц і дапусціць нас, просьбітаў, да здымкі планаў гарадскога ўчастка пры хадайніцтве аб дазволе будаўніцтва новага касьцёла ў горадзе Менску. Разам з тым, мы ў інтарэсах станоўчага вырашэньня мяркуемага хадайніцтва пакорна просім думу знайсьці магчымым, акрамя ўжо прызначанага пляца (былы гарадскі дрывяны склад) назваць яшчэ адзін прыдатны для пабудовы пляц, на той выпадак, калі будаўніцтва касьцёла на першым пляцы прызнана будзе па якой–небудзь прычыне нязручным."

Менская гарадская дума на сваім паседжаньні 27кастрычніка 1903 г. прыняла пастанову:

"У выпадку дазволу адпаведнай уладай пабудовы ў г.Менску другога Р.–Каталіцкага касьцёла адвесьці пад будаўніцтва касьцёла патрэбны для таго ўчастак гарадской зямлі на месцы былога дрывянога склада (рог Каломенскай і Пецярбургскай вуліц) альбо на рагу Захараўскай і Трубнай вул., зважаючы на тое, які з гэтых участкаў будзе больш прыдатны для будаўніцтва касьцёла."

Неўзабаве было сабрана больш як 2 тысячы подпісаў пад лістом, у якім грунтоўна даказвалася неабходнасьць будаўніцтва ў горадзе новай каталіцкай сьвятыні.

Але патрэбен быў фундатар і мецэнат, які добраахвотна ўзяў бы на сябе ўвесь цяжар кіраўніцтва гэтым рухам. Ім стаў Эдвард Вайніловіч, вядомы менскі грамадскі і палітычны дзеяч.



Эдвард Вайніловіч. 1903 г.

ЗАСНАВАЛЬНІК

Эдвард–Антон–Леанард Вайніловіч нарадзіўся 12кастрычніка 1847 г. у маёнтку Сляпянка, што знаходзіўся недалёка ад Менска. Бацька Эдварда, Адам Вайніловіч, паходзіў са

старажытнага беларускага шляхецкага роду, пачынальнікам якога, паводле паданьня, быў у 14 ст. шляхціч Вайніла. Маці пана Эдварда была Ганна з Ваньковічаў. Эдвард Вайніловіч атрымаў выдатную адукацыю. Ён скончыў славутую Слуцкую гімназію, потым вучыўся ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце, стажыраваўся на заводах Германіі, працаваў інжынерам на Пуцілаўскім заводзе ў Пецярбургу. Пасьля сьмерці бацькі пасяліўся ў маёнтку Савічы, (што знаходзіўся ў Слуцкім павеце), дзе займаўся сельскай гаспадаркай. У 1878 г. Вайніловіч быў абраны віцэ–старшынёй Менскага таварыства сельскай гаспадаркі, а праз некалькі гадоў стаў старшынёй гэтага таварыства. З 1906 г. – член Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі, дзе быў старшынёй "Кола Польскага каралеўства, Літвы і Русі". Акрамя гэтага, ён займаў ганаровыя пасады ў шматлікіх дзяржаўных і грамадскіх установах Менскай губерні і Слуцкага павета.

На пачатку XX ст. Вайніловіч актыўна ўдзельнічаў у беларускім адраджэнскім руху. Ён неаднаразова сустракаўся ў Менску з Іванам Луцкевічам і пісьменьнікам Карусём Каганцом (Кастра-віцкім), добра ведаў Вацлава Іваноўскага і Браніслава Эпімах–Шыпілу, матэрыяльна дапа-магаў беларускаму руху. Аднак потым стаў паступова адыходзіць ад яго, бо заўважыў, што большасць беларускіх дзеячоў пачала схіляцца да сацыялістычных ідэй. У 1917–18 гг. Э. Вайніловіч

падтрымаў утварэньне Беларускай Народнай Рэспублікі, удзельнічаў у паседжаньнях яе Рады.

Цяжкія выпрабаваньні паслаў лёс гэтаму чалавеку. Спачатку ён страціў свайго сына Сымона, які нарадзіўся ў 1885 г. і заўчасна памёр у 1897 г. Гісторык Януш Івашкевіч, які добра ведаў Вайніловіча, у сваёй прадмове да І–га тома яго ўспамінаў адзначаў, што толькі рэлігія была той вялікай сілай, якая дазволіла пану Эдварду перажыць гэтае вялікае гора. Вайніловіч пісаў у сваім запавеце:

> "Правіца Божая павісла нада мною, я стаў звяном, вырваным з ланцуга, але гэтая ж Правіца Божая падняла мяне. Бог напоўніў мяне сілай, каб я не ўпаў. Бог зьбярог мне дачку, добрыя якасьці характару і розум якой былі мне відавочным знакам Божай міласэрнасьці над маёй галавой; яны не дазвалялі мне ўпадаць у апатыю і сумненьне."

Але праз некалькі гадоў сям'ю Вайніловічаў напаткала яшчэ адна трагедыя. У 1903 г., літаральна не дажыўшы толькі адзін дзень да свайго 19–годзьдзя, памерла іх дачка Алена–Бянігна, якую так любілі бацькі. Пад уплывам гэтага страшэннага ўдару рука самотнага бацькі занатавала наступныя радкі:

> "Вялікі, Моцны і Магутны Пан Анёлаў. Моцнае плячо Яго ўдары дзеліць паводле сваёй меры, а потым падымае чалавека, каб ён іх пераносіў і не ўпаў, а вытрымаў аж да канца, каб перамагла справядлівасць. З калісьці моцнага дрэва майго роду ападаў лісток за лісточкам і я застаўся толькі як адна галінка, асуджаны на паміраньне, нібы абпаленае громам дрэва, якое ўжо ніякая вясна не ажывіць. Так захацеў Бог."

Эдвард Вайніловіч і ягоная жонка Алімпія з Узлоўскіх прыйшлі да думкі пабудаваць касьцёл у гонар сьв. Сымона і сьв. Алены як помнік аб сваіх памерлых дзецях.

"У выніку ўдараў, якія па волі Ўсявышняга былі нанесены мне, я вырашыў зрабіць упрашальную ахвяру, пабудаваўшы сьвятыню па закліку заступнікаў сваіх памерлых дзяцей сьв. Сымона і сьв. Алены, выбраўшы для гэтага Менск – горад, у якім я найбольш зрабіў для грамадства і ў якім пабудова другой сьвятыні была найбольш пільнай. Пры гэтым мне хацелася, каб у Менску каляровыя купалы мелі новыя формы, і я меркаваў, што не можа быць, каб у натоўпе тых, хто моліцца на новым месцы, ніхто не згадаў аб фундатары, і за мяне і маіх памёрлых – апошніх нашчадкаў старога мясцовага роду – не прачытаў "Анёл Панскі".

Эдвард Вайніловіч зьвярнуўся да менскай каталіцкай грамады са сваёй прапановай, аднак паставіў умову, што ён сам падрыхтуе праект і ніхто не будзе ўмешвацца ў выбар стылю храма і сам працэс ягонага будаўніцтва. Э. Вайніловіч узначаліў дэлегацыю, якая была абрана менскай грамадскасьцю і накіраваўся ў Санкт–Пецярбург, каб асабіста падаць прашэньне на дазвол будаўніцтва новай сьвятыні тагачаснаму міністру ўнутраных спраў Расійскай імперыі.

Адначасова Вайніловіч вельмі ўважліва знаёміцца з узорамі тагачаснага касьцельнага дойлідства, з разнастайнымі архітэктурнымі кірункамі. Ва ўспамінах Вайніловіча ёсьць радкі, якія сьведчаць не толькі аб яго выдатнай мастацкай

культуры як мецэната, але і аб жаданьні стварыць храм, які б сваёй архітэктурай нагадваў аб колішнім адзінстве хрысьціянскага сьвету: “Я пачаў знаёміцца з узорамі і разнастайнымі архітэктурнымі канцэпцыямі. Не жадаў спыняцца на гатычным стылі, па–першае, таму, што ён стаў вельмі распаўсюджаным на той час пры будаўніцтве каталіцкіх сьвятыняў у Расіі, па–другое, таму, што вельмі адрозьніваўся ад стылю праваслаўных храмаў, якія існавалі ў нашым краі, і гэтым як бы падкрэсьліваў падзел у веравызнаньні класаў нашага грамадства, і я спыніўся на раманскім стылі, росквіт якога прыпадае на час, калі ўсходняя царква існавала ў еднасьці з Рымам”.

АРХІТЭКТАРЫ

Падчас гэтых пошукаў у рукі Вайніловіча трапіла ілюстрацыя з відам касьцёла ў Ютрасіне, што быў пабудаваны ў 1900 г. па заказу князя З.Чартарыйскага паводле праекта архітэктара Т.Пайздэрскага.



Тамаш Пайздэрскі.
Пачатак 20 ст.

Архітэктура гэтага храма так уразіла Вайніловіча, што ён адразу едзе ў Варшаву, каб асабіста сустрэцца з аўтарам праекта.

Там ён вельмі ўважліва знаёміцца з праектнымі матэрыяламі Ютрасінскага касьцёла і, " ... параўнаўшы яго з відамі нешматлікіх помнікаў раманскага будаўніцтва ў нашым краі, а галоўнае, са сьвятынямі былых рэйнскіх дзяржаў, пры пэўных маіх рэмінісцэнцыях з падарожжа па Італіі, мы разам з архітэктарам спыніліся на пэўным тыпе, які з Божай дапамогай на працягу наступных гадоў быў выкананы".

Такім чынам Т. Пайздэрскі атрымаў ад Эд.Вайніловіча заказ на праектаваньне новага каталіцкага касьцёла ў Менску.

Тады Тамаш Пайздэрскі (1864–1908) быў ужо даволі вядомым архітэктарам. Адукацыю ён атрымаў у політэхнічным інстытуце Шарлотэнбурга (каля Берліна), дзе вучыўся з 1886 па 1890 г. Потым працягваў вучобу ў Францыі. У 1895 г. ён пасьпяхова здаў экзамен на дзяржаўнага прускага будаўніка. Пасьля гэтага працаваў у Берліне. З 1895 г. распачаў самастойную прыватную архітэктурную практыку. Па ягоных праектах быў пабудаваны шэраг прыватных дамоў і палацаў у Берліне,Варшаве і Познані. Найбольш значныя ягоныя працы – гэта праекты касьцёлаў, пабудаваных у канцы XIX– пач. XX стагодзьдзяў. У 1903 г. Пайздэрскі пераехаў у Варшаву, дзе ён з 1905 па 1907 год быў прафесарам Акадэміі мастацтваў.

Новаму менскаму касьцёлу было наканавана стаць апошняй і самай значнай працай гэтага таленавітага майстра. За кароткі час праект быў падрыхтаваны.

Тым часам у Менску 20 верасьня 1904 г. у канцылярыі губернатара быў зарэгістраваны ліст, які, як ужо гаварылася раней, падпісалі больш за 2 тысячы жыхароў горада. У гэтым лісьце было сказана:

> " Што датычыць месца для будаўніцтва, дык такое прапануе даць бясплатна гарадская ўправа з участка гарадской зямлі, якая знаходзіцца на рагу Захараўскай і Трубнай вуліц...
>
> Сродкі на ўзьвядзеньне сьцен і даху касьцёла абавязаўся даць дваранін Эдвард Адамавіч Вайніловіч, сродкі ж на ўнутранае абсталяваньне і аздабленьне будуць сабраны добраахвотнымі ахвяраваньнямі, у шчодрым прыплыве якіх ёсьць поўная ўпэўненасьць.
>
> Намаганьнем дваранiна Э.А. Вайніловіча зроблены план і каштарыс, складзеныя варшаўскім архітэктарам У. Марконі, якія пры гэтым дадаюцца..." [1,2]

Дарэчы, імя вядомага польскага архітэктара Уладыслава Марконі, як аўтара праектна–каштарыснай дакументацыі менскага касьцёла, неаднаразова згадваецца ў розных афіцыйных паперах. Аднак ва ўсіх тагачасных публікацыях у перыядычным друку аўтарам гэтага праекта называецца толькі Т. Пайздэрскі. Прычыну гэтага мы знаходзім у прыгаданых успамінах Вайніловіча. Рэч у тым, што паводле расійскіх законаў Пайздэрскі, як замежны грамадзянін, не меў юрыдычнага

Праект пабудовы ў г. Менску каталіцкага касьцёла. 1904 г.

дазволу на праектаваньне і будаўніцтва касьцёлаў на тэрыторыі Расійскай імперыі. Відаць, таму рабочая дакументацыя праекта была зроблена ў майстэрні У. Марконі. Афіцыйна нават нагляд за будаўніцтвам праводзілі іншыя людзі, але на самой справе ўсе працы вяліся пад кіраўніцтвам Пайздэрскага.

> "Будаўніцтва касьцёла спачатку вёў сам Пайздэрскі, але таму што фармальнага на гэта права, як чужаземец (пазнаньчык) не меў, яго афіцыйна замяніў інжынер Сьвяньціцкі, а калі ў працэсе будаўніцтва жыцьцё Пайздэрскага скончылася, завяршыў будаўніцтва архітэктар Гай з Варшавы."

Супраць таго, каб ў Менску была пабудавана новая каталіцкая сьвятыня, вельмі рэзка пратэставаў менскі і тураўскі праваслаўны біскуп Міхаіл. Ён спачатку прыводзіў усе фармальныя меркаваньні на гэты конт, але ўсё ж падкрэсьліваў, што будаўніцтва ў горадзе яшчэ аднаго касьцёла нельга дазваляць "в интересах поддержания в крае православия и русской народности, ввиду враждебного настроения минских католиков ко всему русскому..." [1,3]

Менскі ж губернатар меў іншае меркаваньне: у сваім лісьце да міністра ўнутраных спраў ад 13 кастрычніка 1904 г. зазначыў, што "...с точки зрения политической я не опасаюсь сооружения в городе нового католического храма, т.к. русское дело в крае нисколько не пострадает от существования в Минске трёх костёлов вместо двух..."

Афіцыйны дазвол на будаўніцтва новага менскага каталіцкага касьцёла быў атрыманы ў Міністэрстве ўнутраных спраў 9 сакавіка 1905 г. 19 сакавіка гэтага ж года ў зале менскай гарадской управы, што знаходзілася на рагу вуліц Губернатарскай і Юраўскай, адбыўся збор парафіян менскага катэдральнага касьцёла. Гэтае паседжаньне ўрачыста адкрыў кс. дэкан Адам Акка. Спачатку была заслухана кароткая справаздача камітэта, які быў створаны ў 1903 г. і займаўся справамі атрыманьня дазволу на будаўніцтва новага каталіцкага касьцёла ў Менску. Пасьля гэтага кс. Акка ўрачыста зачытаў заяву Эдварда і Алімпіі Вайніловічаў, згодна з якой яны, жадаючы ўшанаваць памяць па сваіх заўчасна памерлых дзецях, прапанавалі ажыцьцявіць будаўніцтва новага касьцёла за ўласны кошт. Разам з тым фундатары



Будаўніцтва касьцёла. 1908 г.


AVE MARIA GRATIA PLENA
SWIATAJA ALENA SWIATY SYMON


JEZU, UCIAŚ TOBIE I ŚWIĘTO CONTIGO IN JESU, EN TI, CONFIO!
ПРЫЙДЗІ ВАЛАДАРСТВА ТВАЁ!





паставілі наступныя ўмовы:

1. Касьцёл павінен будавацца паводле прапанаванага Вайніловічамі праекта.

2. Фундатары прымаюць на сябе абавязкі па будаўніцтву муроў і даху храма. Усе астатнія працы і, у першую чаргу, абсталяваньне інтэр'ераў, павінны быць выкананы за кошт ахвяраваньняў парафіян.

3. Новы касьцёл павінен быць асьвечаны ў гонар сьв. Сымона і сьв. Алены, а калі гэта будзе немагчыма па канонах Рымска-Каталіцкай царквы, то сьв. Алены альбо Маці Божай (*Immaculata Conceptio*) – Бязьвіннага Пачацьця (8 сьнежня).

4. Над галоўным уваходам павінна быць замацавана ганаровая табліца ў выглядзе барэльефа з надпісам на лацінскай мове, што гэты Дом Божы быў пабудаваны ў памяць аб заўчасна памерлых дзецях шлюбу Вайніловічаў.

У дадатак да гэтага кс. А. Акка паведаміў, што праект касьцёла ўжо падрыхтаваны і ўзгоднены ў адпаведных інстанцыях. Некаторыя з прысутных выказаліся за тое, што неабходна пабудаваць храм большых памераў і што жыхары Менска павінны самі сабраць неабходныя грошы, але большасьць выступаючых падтрымала прапанову Вайніловічаў. На заканчэньне доктар Сьвяньціцкі сказаў, што неўзабаве трэба будзе паклапаціцца аб павелічэньні колькасьці каталіцкіх храмаў у горадзе. Згадвалася неабходнасьць аднаўленьня

дамініканскага касьцёла, які быў перабудаваны пад казармы.

N.B. Дамініканскі касьцёл знаходзіўся на рагу сучасных вуліц Інтэрнацыянальнай і Энгельса, дзе сёньня каля яго падмуркаў пабудаваны Палац Рэспублікі.

Пасьля невялікай дыскусіі прапанова Вайніловічаў была аднагалосна падтрымана.

Адначасова быў створаны камітэт, які складаўся з 14 членаў і 6 кандыдатаў для кіраўніцтва працамі па будаўніцтву новага касьцёла.



Касьцёл сьв. Сымона і сьв. Алены. 1908–1910 гг.

Старшынёй камітэта адзінадушна быў абраны Э. Вайніловіч. У склад камітэта ўвайшлі такія вядомыя асобы, як кс. А. Акка, В. Лапот, П.Ваньковіч, менскі гарадскі галава М.Валовіч, Е.Любанскі, граф Е.Чапскі, Ян Ельскі і інш [3]. Трэба адзначыць, што 11 красавіка 1905 г. Э. Вайніловіч адмовіўся ад пасады старшыні камітэта. Ягонае месца заняў гарадскі галава М. Валовіч.

11 красавіка 1905 г. гарадская дума пасьля перамоў з гарадской управай прыняла наступнае рашэньне:

> "Адвесьці пад будаўніцтва рымска–каталіцкага касьцёла ўчастак гарадской зямлі на рагу Захараўскай і Трубнай вуліц мераю 1305,10 кв.саж., з якога павінна адыйсьці пад пашырэньне Затурэмнага завулка 59,32 і Трубнай вуліцы 132,89 кв. саж., даручыўшы гарадской управе ўвайсьці з арандатарамі гэтых пляцаў Баярскай і Блюнаса ў добраахвотнае пагадненьне арэндаваных імі пляцаў ад збудаваньняў, пры гэтым грашовая ўзнагарода за зьняцьце пабудоў павінна быць улічана Камітэтам да пабудовы касьцёла, але ў выпадку адмовы кіраўніцтва прыме рашэньне прымусовага высяленьня."

А. Блюнас адмовіўся ад свайго пляца "на падставе добраахвотнага пагадненьня 21красавіка 1905 г." Суседні пляц каталіцкай грамадзе ўдалося атрымаць толькі ў 1907 г., калі будаўніцтва касьцёла вялося ўжо поўным ходам. Спатрэбілася спецыяльная пастанова віленскай судовай палаты, каб гэты пляц быў перададзены камітэту па будаўніцтву касьцёла разам з "двума драўлянымі дамамі і афіцынай пры іх, садам і плотам..."



Партал касьцёла. 1910 г.

Праект будаўніцтва храма быў разгледжаны і ўхвалены на паседжаньні Будаўнічага аддзяленьня Менскага губернскага праўленьня 15 сакавіка 1905 г.

БУДАЎНІЦТВА

Будаўніцтва храма пачалося ў маі 1905 г., калі былі закладзены падмуркі. Архітэктар Т. Пайздэрскі, як замежны грамадзянін, не меў правоў на ажыццяўленьне афіцыйнага нагляду за ходам будаўніцтва, таму ўсе фармальныя правы па нагляду "... за будаўнічымі працамі па ўзьвядзеньні ў горадзе Менску Рымска–Каталіцкага касьцёла" былі даручаны грамадзянскаму інжынеру Ф. Барановічу, які прыступіў да сваіх абавязкаў 27 мая 1905 г., але, як успамінаў потым Э. Вайніловіч, Пайздэрскі пастаянна наведваў будаўніцтва, сачыў за працай, рабіў замалёўкі ўзораў архітэктурных дэталяў:

> "Узоры ўсіх дэталяў, нават завесы і клямкі на дзьверы, падрыхтаваў сам Пайздэрскі і паводле іх усё выконвалася, каб цэласнасьць стылю і характар пабудовы былі цалкам вытрыманы."

25 верасьня 1906 г. урачыстае асьвячэньне краевугольнага каменя храма зрабіў ксёндз–дэкан К. Міхалкевіч. Сучасьнікі былі вельмі зьдзіўлены надзвычай высокай якасьцю будаўнічых работ. Дастаткова сказаць, што спецыяльную чырвоную цэглу разнастайнай канфігурацыі прывозілі ў Менск у асобых скрынях ажно з Чэнстаховы, а дахаўку з Влацлаўку. Для калон і алтароў быў падрыхтаваны ружовы пясчанік і келецкі мармур.

30 сакавіка 1906 г. інжынер С. Сьвяньціцкі паведаміў у Менскае губернскае праўленьне, што

ён будзе ўзначальваць усе працы па будаўніцтву новага касьцёла ў Менску замест Ф. Барановіча. Улетку 1907 г. яго замяніў варшаўскі гарадскі архітэктар Г. Гай, які і кіраваў усёй працай да поўнага завяршэньня будаўніцтва храма.

Сучаснікі адзначалі, што муры касьцёла расьлі як на дражджах. Увосень 1908 г. храм ужо быў накрыты дахоўкай і адначасова разабраны рыштаваньні. Пачалося аздабленьне інтэр'ераў касьцёла. Па патрабаваньні Э. Вайніловіча "для захаваньня цэласнасьці стылю ўсе каменныя і скульптурныя працы ўнутры касьцёла, як алтар, бронза, амбон, баляскі, падлога і інш., былі аддадзены ў адны рукі вельмі здольнага скульптара Зыгмунта Отта з Варшавы". Аконныя вітражы былі выкананы паводле эскізаў мастака Ф. Бруздовіча, заснаваных на мясцовых матывах.

Алімпія Вайніловіч асабіста ахвяравала грошы на амбон, баляскі і падлогу. Вайніловічаў падтрымалі іншыя людзі, якія дапамаглі сабраць неабходныя сродкі на аздабленьне касьцёла. Аляксандр Болтуць перадаў будаўнічаму камітэту 1000 рублёў, граф Е. Чапскі таксама 1000 рублёў, а кс. Акка пераказаў 1500 рублёў.

У 1909 г. на касьцёльную вежу былі падняты тры званы. Самы вялікі "Міхал", які важыў 2373 фунта, быў названы ў гонар сьв. Міхала, патрона магілёўскай дыяцэзіі. Другі, "Эдвард", важыў 1287 фунтаў, а трэці, "Сымон" – 760 фунтаў.



№32 - Новы касьцёл у Менску. Да 1910 г.

Па жаданні фундатараў галоўны ўваход у сьвятыню быў аздоблены барэльефам з белага каменя з надпісам на лацінскай мове:

"A.M.D.G. Templum hoc piae memoriae liberorum suorum Simeonis MDCCCLXXXV † MDCCCXCVII et Helennae MDCCCLXXXIV † MCMIII c. Olimpia Uzlowska conjuge procreatorum dedikat vevetque Eduardus Wojnillowicz A.D. MCMVII"

["A.M.D.G. – Ad maiorem Dei Gloriam. На вялікшую хвалу Божую гэтую сьвятыню ў набожную памяць сваіх дзяцей Сымона (год нараджэньня 1885 † год сьмерці 1897) і Алены (год нараджэньня 1884 † год сьмерці 1903) збудавалі Алімпія Узлоўская і Эдвард Вайніловіч, бацькі. A.D. Anno Domini – Год Панскі 1907."]

Тэрыторыя новага менскага касьцёла была абнесена каменнай агароджай, якая мела дзьве парадныя брамы з боку вул. Захараўскай. Як адзначалі сучаснікі, яна ўдала дапоўніла архітэктурны комплекс касьцёла і "...выглядала вельмі ўнушальна і прыгожа".

Адначасова з будаўніцтвам храма вяліся перамовы з уладамі па зацьвярджэньні новай менскай парафіі. 30 лістапада 1909 г. на паседжаньні камітэта па будаўніцтву касьцёла была абрана камісія ў складзе кс. дэкана М.Сеўрука, кс.М. Маеўскага, а таксама паноў В.Лапота і С.Венцлавовіча, якая павінна была вызначыць межы новай парафіі. На падставе яе прапаноў магілёўскі каталіцкі арцыбіскуп мітрапаліт кс. Ключынскі 20 верасьня 1910 г. зацьвердзіў новую менскую парафію, а пробашчам быў прызначаны былы Ігуменскі дэкан кс. Вітальд Тамашэўскі.

Пачалася падрыхтоўка касьцёла, "каб была магчымасьць служыць набажэнствы".

Э. Вайніловіч атрымаў дазвол, каб у новы касьцёл была перанесена вялікая каштоўнасьць: на галоўным алтары храма было ўсталявана "...шанаванае, як цудоўнае, расьпяцьце Збаўцы на крыжы" са старажытнай слуцкай фары, што, як лічыў Вайніловіч, было "знакамітай работы з усімі рысамі школы Віта Ствоша".

Сям'я Скірмунтаў з Парэчча ахвяравала старажытны абраз Маці Божай.

АСЬВЯЧЭНЬНЕ

Дзень 21 лістапада 1910 г. ператварыўся ў сапраўднае сьвята. Амаль увесь горад сабраўся каля новай сьвятыні. Ва ўрачыстым асьвячэньні новага храма, якое выканаў кс. дэкан В. Чачот, узяло ўдзел усё менскае каталіцкае духавенства, фундатары, а таксама самыя паважаныя людзі ў горадзе.

На жаль, на тое, каб цалкам скончыць усе працы па аздабленьні храма, не хапала сродкаў. На гэта неаднаразова звярталі ўвагу члены будаўнічага камітэту. Не быў пабудаваны мураваны будынак плябаніі, запланаваны паводле праекту Т. Пайздэрскага, які павінен быў злучацца з касьцёлам спецыяльнай мураванай галерэяй. Гэта адзначалася ў спецыяльнай запісцы камітэта



Галерэя касьцёла. 1910 г.

ад 5 лістапада 1911 г., дзе згадвалася пра неабходнасць будаўніцтва плябаніі. У самім касьцёле патрэбна было скончыць будаўніцтва алтароў, зрабіць падлогу, усталяваць арганы і гэтак далей.

Фундатары касьцёла, якія спачатку жадалі ахвяраваць грошы толькі на будаўніцтва муроў і

даху храма, дадаткова "...усклалі на сябе ўсталяваньне 3–х алтароў, амбона і градуала (бар'ер, які аддзяляе прэзбітэрый). Адначасова Э. Вайніловіч запрасіў мастака Ф. Бруздовіча, якога добра ведаў, і які "...паводле эскізаў, узгодненых са мною, пачаў рабіць паліхромныя росьпісы касьцёла". На жаль, Бруздовіч не пасьпеў скончыць росьпісы інтэр'ераў храма. У пачатку І–й сусьветнай вайны ён быў высланы ў Харкаў як грамадзянін замежнай дзяржавы.

У невялікай каплічцы, што выходзіла на Захараўскую вуліцу, Э. Вайніловіч паставіў



Галоўны алтар касьцёла сьв. Сымона і сьв. Алены. 1910 г.

бронзавую копію Маці Божай, што знаходзілася на сямейных могілках Вайніловічаў у маёнтку Савічы.

У 1916 г. была пабудавана новая мураваная плябанія, але яна не была злучана з касьцёльнай галерэяй, як гэта прадугледжваў праект Т.Пайздэрскага. Будынак плябаніі вырашылі паставіць у заходняй частцы касьцёльнага пляца, і адным са сваіх фасадаў ён выходзіў на Трубны завулак. Драўляны будынак старой плябаніі (які быў пабудаваны яшчэ ў 1870 г. як жылы дом) доўга стаяў на сваім месцы і быў разабраны толькі пасьля 2–й сусьветнай вайны.



Новы касьцёл у Менску. 1912 г.

НОВЫ ЧАС

Менскі касьцёл сьв. Сымона і сьв. Алены, як і многія іншыя сьвятыні на Беларусі, напаткаў сумны лёс. У 1923г. касьцёл першы раз разрабавалі бальшавікі. Тады з яго вывезьлі амаль ўсё – мэблю, гадзіньнікі, абразы, посуд, бялізну і нават чарнільніцы.

Канчаткова храм быў зачынены ў 1932 г. Пасьля гэтага яго прыстасавалі пад патрэбы Дзяржаўнага польскага тэатра БССР, а перад 2-й сусьветнай вайной тут разьмясьцілася кіна-



Від новага касьцёла ў Менску. 1918 г.

студыя. У 1941г. нямецкія акупацыйныя ўлады дазволілі адчыніць касьцёл для набажэнства, але пасьля вайны храм быў канчаткова зачынены на доўгі час.

Пасьля 2–й сусветнай вайны будынак касьцёла быў перабудаваны пад кінастудыю "Савецкая Беларусь". У 1945–47 гг. да прэзбітэрыя была зроблена новая 2–х павярховая прыбудова. Сам касьцёл літаральна аббудавалі рознымі маленькімі памяшканьнямі, дзе зьмясьціліся тэхнічныя службы кінастудыі.

Потым над сьвятыняй навісла рэальная пагроза поўнага зьнішчэньня. Падчас распрацоўкі праекта рэканструкцыі сучаснай плошчы Незалежнасьці ў 1950–60–я гады комплекс касьцёла сьв. Сымона і сьв. Алены цалкам ігнараваўся як выдатны помнік гісторыі і архітэктуры. Яго прапаноўвалі альбо цалкам зруйнаваць, узарваць, альбо грунтоўна перабудаваць, каб зьнішчыць ягоны касьцёльны выгляд. У 1960–х гадах быў распрацаваны праект самага вялікага ў Менску шырокафарматнага кінатэатра, які планавалася пабудаваць на месцы зьнішчанага храма.

Толькі дзякуючы намаганьням грамадскасьці касьцёл сьв. Сымона і сьв. Алены ўдалося выратаваць. У 1969–1971 г.г. быў распрацаваны праект рэканструкцыі храма пад Дом кіно. Згодна з гэтым праектам упершыню былі выкананы працы па рэстаўрацыі фасаду касьцёла і разабраны ўсе пазьнейшыя прыбудовы за выключэньнем той,

якая прымыкала да алтарнай часткі касьцёла. Адначасова гэтым праектам прадугледжвалася далейшае зьнішчэньне інтэр'ераў храма. Была разабрана агароджа з боку вул. Савецкая і замураваны два ўваходы на тэрыторыю касьцёла. На шчасьце, каваная металічная брама не была зьнішчана, а толькі перанесена на вул. Берсана. У хуткім часе пасьля гэтага комплекс касьцёла сьв. Сымона і сьв. Алены ў Менску быў прыняты пад ахову як помнік культуры рэспубліканскага значэньня.

Толькі ў 1990 г. гэтая сьвятыня была канчаткова вернута Рымска–Каталіцкай канфесіі і пачаліся працы па яе адраджэньні і рэстаўрацыі.



Фрагмент забудовы сучаснай пл. Незалежнасьці. 1950–я гады.

ВЯРТАНЬНЕ

У атмасферы грамадскага абнаўленьня канца 80–ых гадоў, калі ўзьніклі перадумовы духоўнага, рэлігійнага ўздыму, адрадзілася і надзея вярнуць сьвятыню вернікам. У 1986 г. менскія каталікі стварылі ініцыятыўную групу, якая ўзьняла пытаньне аб рэгістрацыі "другой рэлігійнай каталіцкай грамады". У 1988 г. гэты рух падтрымаў кс.–магістр Уладыслаў Завальнюк, які тады быў прызначаны вікарыем менскага кальварыйскага касьцёла "Узвышэньне Сьвятога Крыжа". 16 сакавіка 1989 г. грамада была афіцыйна зарэгістравана ўладай. Але калі дайшло да вяртаньня будынка касьцёла, які на той час належаў Саюзу кінематаграфістаў, высьветлілася, што ў Беларусі яшчэ маюць законную сілу дэкрэты аб адносінах да царквы 1918 г., падпісаныя Леніным, згодна з якімі ўся царкоўная маёмасьць належыць мясцовым Саветам. І толькі людская вера натхняла людзей штовечар зьбірацца разам у супольнай малітве, на працягу года ахвяраваць здароўем праз галадоўкі і шматлікія бясплённыя блуканьні па няветлівых калідорах улады, натыкаючыся на неразуменьне і пустыя абяцаньні чыноўнікаў, цярпець іх зьдзекі.

Пакуты і настойлівасьць не былі марнымі. 16 мая 1990 г. з'явілася рашэньне Мінгарвыканкама "Аб перадачы будынка па вул. Савецкая, 15 другой рэлігійнай грамадзе Рымска–Каталіцкай



Перанясеньне сьвятога Агню
ад праваслаўнага сабора да касьцёла. 1995 г.

царквы". Праўда, напачатку была вернута толькі малая частка касьцёла – галерэя, куды адразу ж унесьлі абраз "Езус Хрыстус у цярновай кароне", які служыў і служыць сімвалам адраджэньня веры і вяртаньня храмаў. Але спатрэбіўся яшчэ доўгі час і намаганьні людзей, каб цалкам вярнуць сьвятыню. 21 лістапада 1990 г. ксёндз біскуп Тадэвуш Кандрусевіч адслужыў урачыстую Сьвятую Імшу, бласлаўляючы вернікаў у іх духоўнай і фізічнай працы па аднаўленьні дзеяньня касьцёла.

АДРАДЖЭНЬНЕ



Працэсія Божага Цела. 1996 г.

Дзякуючы вялікім намаганьням пробашча ксяндза–магістра Уладыслава Завальнюка касьцёл паступова адраджаецца і становіцца адным з цэнтраў не толькі рэлігійнага, але культурнага і навуковага жыцьця. 11 верасня 1993 года выйшла ў эфір радыёпраграма "Голас душы", якая дапамагае людзям нават ў найбольш аддаленых месцах паяднацца з Панам Богам.

У касьцёле заснаваны таксама каталіцкі часопіс "Вера і жыцьцё". Выдавецкім цэнтрам друкуецца шматлікая хрысьціянская літаратура ў перакладзе на беларускую мову.

Пры сьвятыні працуе нядзельная школа для дзяцей і дарослых, праходзіць катэхізацыя перад прыняцьцем Сьв. Сакрамантаў: Хрышчэньня, Шлюбу, Споведзі. Для яшчэ большага духоўнага ўзбагачэньня праводзяцца дабрачынныя канцэрты, адчыненыя мастацкія выставы. Пры касьцёле таксама дзейнічае дзіцячы хор "Голас душы".

Суполка моладзі "Сьвятло жыцьця" дапамагае людзям, якія яшчэ не ведаюць Пана Бога, пазнаць Яго і палюбіць. 25 мая 1995 г. было зарэгістравана "Хрысьціянскае таварыства міласэрнасьці". Людзям, якія жывуць у нястачы, аказваецца гуманітарная дапамога, дзейнічаюць бясплатныя сталоўкі.

Для духоўнага выхаваньня дзяцей і моладзі ёсьць вялікая патрэба ў існаваньні "духоўнага відэацэнтра хрысьціянскіх фільмаў".

Арганізоўваюцца паездкі хворых дзяцей за мяжу з мэтай аздараўленьня. Пры касьцёле дзейнічае тэатр аднаго акцёра "Зьніч". У бліжэйшы час плануецца стварыць музей па гісторыі касьцёла сьв. Сымона і сьв. Алены. Пачатак гэтаму музею паклала пастаянна дзеючая выстава дакументаў па гісторыі касьцёла з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. З мэтай аднаўленьня традыцый школы арганістаў, якая існавала ў Менску ў 19 ст., пры касьцёле будзе дзейнічаць цэнтр арганнай музыкі.

28 верасьня 1996 г. у Менску распачаў сваю працу першы ў гісторыі краіны Сінод Рымска–Каталіцкага касьцёла. З гэтай нагоды была пастаўлена перад касьцёлам бронзавая скульптура сьвятога Міхала Арханёла, якую асьвяціў першы кардынал Беларусі Казімір Сьвёнтэк.



Помнік Міхалу–Арханёлу, Апекуну Беларусі

РЭСТАЎРАЦЫЯ



Пачатак рэстаўрацыі. 1992 г.

Навуковым кіраўніком прац па рэстаўрацыі касьцёла сьв. Сымона і сьв. Алены была прызначана вядомы беларускі рэстаўратар Л.Іванова. Пад яе кіраўніцтвам пачаліся навуковыя дасьледаваньні і падрыхтоўка праекта рэстаўрацыі помніка. Падчас натурных дасьледаваньняў інтэр'ераў храма высьветлілася, што першапачатковыя росьпісы касьцёла знаходзяцца пад

слоем тынкоўкі, адначасова быў выяўлены арнаментальны паліхромны клеявы жывапіс на скляпеньнях, сьценах і калонах касьцёла. На падставе гэтых дасьледаваньняў былі зроблены дакладныя копіі малюнкаў, якія потым перанесьлі на існуючую тынкоўку. Гэта дазволіла аднавіць аўтарскія росьпісы скляпеньняў і апсіды Храма, якія выканаў Ф. Бруздовіч. У бліжэйшы час плануецца далейшае аднаўленьне жывапісу на калонах і сьценах.

Праектам рэстаўрацыі прадугледжваецца максімальна наблізіць інтэр'еры касьцёла да яго першапачатковага выгляду, аднавіць страчаныя гістарычныя вітражы, металічныя дэталі, мэблю, алтары і г.д. Плануецца аднавіць разбураную ў 1970–я гады частку каменнай агароджы і касьцельныя брамы. Каб цалкам завяршыць ансамбль касьцёла сьв. Сымона і сьв. Алены, неабходна, паводле аўтарскага праекта архітэктара Т. Пайздэрскага, пабудаваць мураваную плябанію, якая злучаецца з касьцёлам праз галерэю..



Храм адраджаецца. 1994 г.

На жаль, як гэта было на пачатку стагодзьдзя, касьцёл не мае сродкаў не толькі на набыцьцё так неабходных званоў і арганаў, але і на заканчэньне рэстаўрацыйнай працы.

І сёньня, успамінаючы вялікі духоўны прыклад сям'і Вайніловічаў, мы маем надзею на аднаўленьне старадаўняй беларускай традыцыі мецэнацтва, таму нагадваем рахунак касьцёла:

Разліковы рахунак № 3015 000 000 189
код 287 ф–л 521 ААБ "Беларусбанк" г.Мінска;
валютны рахунак 3015 000 000 189
[conto 3015 000 000 189
in philial 521 of "BelarusBank"]

Шчыра дзякую ўсім, хто дапамог у выданьні гэтай кнігі.

Пробашч касьцёла
сьв. Сымона і сьв. Алены
ксёндз–магістр
Уладыслаў Завальнюк

Крыніцы:

[1,1] Нацыянальны Гістарычны Архіў (НГА) Беларусі, ф. 299, воп. 5, спр. 1782, арк. 7–7адв.

[1,2] там сама, арк. 5.

[1,3] там сама, арк. 54

[2] там сама, ф. 1, воп, 1, спр. 3047, арк. 1–1адв.

[3] там сама, ф. 1781, воп. 5, спр. 114, арк. 2–5.

Літаратура:

Грыцкевіч А. П. Вайніловіч Эдвард. — Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 2. — Мн., 1994

Пазьняк З. Рэха даўняга часу. — Мн., 1985

Чернатов В. Страничка каменной летописи. — Неман, 1976, № 3

Fruba P. Pajzderski Tomasz. — PSB, t. XXV. — Wrocław, 1980.

Slizień Wł. Nowy kościół w Mińsku Litewskim. — Tygodnik Wileński, 1911, № 2.

Wojniłłowicz E. Wspomnienia (1847–1928). Cz. 1. Wilno, 1931.

Wyczyński K. Tomasz Pajzderski. — Architekt, 1909, styczeń, z. 1.

Дело Минского губернского дворянского депутатского собрания о дворянском происхождении рода Войниловичей. — НГА Беларусі, ф. 319, воп. 2, спр. 531.

Дело Минской городской управы об отводе плаца под постройку римско–католического костёла. — НГА Беларусі, ф. 1, воп. 1, спр. 3047.

Дело канцелярии Минского гражданского губернатора о постройке римско–католического костёла на углу Трубной и Захарьевской улиц в г. Минске во имя Св. Симеона и Елены. — НГА Беларусі, ф. 299, воп. 5, спр. 1782.

Дело о постройке в губернском городе Минске нового каменного костёла. — НГА Беларусі, ф. 1781, воп. 5, спр. 114.

Падпісана да друку 20.12.96. Фармат 60X84 1/16. Папера афсетная № 1.
Афсетны друк. Ум. друк. арк. 3,26. Тыраж 8000 экз. Заказ № 78.
Надрукована у Беларускім нав.-дасл. цэнтры інфармацыі і маркетынгу АПК.
Ліцэнзія ЛВ № 1225 ад 25.10. 1995.
220108. Мінск, вул. Казінца, 86, корп. 2.


ГОЛАС ДУШЕ


ТОЛАС ДУШЫ